Святлана МАЖАРОЎСКАЯ

# Мелодыя вясны

Яшчэ завеі рэха гулка кліча.
Глыбокі сон чаруе стары клён.
Калі блакіт нябёс узнясе аблічча,
Мелодыю вясны пачуе ён.

У мелодыю складацца будуць гукі
Птушыных спеваў, шчодрае цяпло.
Да сонейка раскрыў галінкі-рукі,
Як быццам дзён халодных не было.

У мелодыю складацца будуць песні:
Абуджаны зялёны аксаміт
Пад подыхам вясновым зноў уваскрэсне,
Даруючы яскравы каларыт.

І загучыць сімфонія ў прыродзе,
Усюды льюцца дзіва-галасы.
Суквецце спеваў – усё гучыць у згодзе
Абуджанай нястомленай красы.